# Цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай мове: сістэма падрыхтоўкі вучняў

## Магчымыя заданні і рэкамендацыі да іх выканання

# Праграма падрыхтоўкі вучняў да цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай мове

УВОДЗІНЫ

Тэсціраванне як форма кантролю ведаў. Раздзелы навукі аб мове. Паняцце пра літаратурную норму

ФАНЕТЫКА. АРФАЭПІЯ. ГРАФІКА. АРФАГРАФІЯ

Фанетыка як навука. Фанетычная сістэма беларускай мовы. Класіфікацыя гукаў. Узаемадзеянне гукаў у моўнай плыні. Фанетычныя законы беларускай мовы

Арфаэпія. Нормы беларускага літаратурнага вымаўлення. Склад. Складападзел. Націск.

Арфаграфія. Напісанні, заснаваныя на фанетычным і марфалагічным прынцыпах

Правапіс ***о, э — а (ы); е, ё — я.*** Галосныя ў складаных словах. Правапіс спалучэнняў зычных у словах іншамоўнага паходжання

Правапіс ***у — ў***. Адлюстраванне па пісьме дзекання і цекання, пажаўжэння зычных

Правапіс прыстаўных галосных і зычных. Правапіс мяккага знака і апострафа

Ужыванне вялікай літары

СКЛАД СЛОВА І ПРАВАПІС. СПОСАБЫ СЛОВАЎТВАРЭННЯЯ

Склад слова. Марфемы, іх прызначэнне. Аснова і канчатак. Корань слова. Аднакаранёвыя словы і формы аднаго слова. Аманімія каранёў

Правапіс прыставак. Правапіс ***і, ы, й*** пасля прыставак

Правапіс зычных на стыку марфем (прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса)

Правапіс складаных слоў (назоўнікаў і прыметнікаў)

Асноўныя спосабы словаўтварэння ў беларускай мове

МАРФАЛОГІЯ І ПРАВАПІС

**Назоўнік** як часціна мовы. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў. Лік і род назоўнікаў. Скланенне назоўнікаў. Правапіс склонавых канчаткаў і чуфіксаў назоўнікаў. Рознаскланяльныя і нескланяльныя назоўнікі. Дапасаванне ў словазлучэннях з нескланяльнымі назоўнікамі

**Прыметнік** як часціна мовы. Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Склонавыя канчаткі прыметнікаў. Правапіс суфіксаў прыметнікаў

**Лічэбнік** як часціна мовы. Ужыванне і правапіс лічэбнікаў

**Займеннік** як часціна мовы. Ужыванне займеннікаў. Скланенне і правапіс займеннікаў

**Дзеяслоў** як часціна мовы. Граматычныя катэгорыі дзеяслова. Правапіс асабовых канчаткаў

Асобыя **формы дзеяслова** — дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе. Ужыванне, утварэнне і правапіс дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў

**Прыслоўе** як часціна мовы. Ступені параўнання прыслоўя. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да іх

Ужыванне і правапіс часціц ***не, ні***

СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ

**Словазлучэнне**. Спосабы сувязі слоў у словазлучэнні. Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове

**Граматычная аснова сказа**. Спосабы выражэння дзейніка і выказніка. Сказы адна- і двухсастаўныя. Тыпы аднасастаўных сказаў. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам. Каардынацыя дзейніка і выказніка ў ліку і родзе

**Аднародныя члены сказа**. Аднародныя і неаднародныя азначэнні. Сказы з некалькімі радамі аднародных членаў. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі (у тым ліку і з абагульняльным словам)

**Адасобленыя члены сказа.** Адасабленне азначэнняў, прыдаткаў, акалічнасцей, дапаўненняў; далучальных і ўдакладняльных членаў сказа)

**Зваротак. Параўнальны зварот.** Знакі прыпынку ў сказах са звароткам і параўнальным зваротам

**Пабочныя і ўстаўныя канструкцыі,** іх размежаванне, знакі прыпынку пры іх

**Складаныя сказы.** Віды складаных сказаў

Знакі прыпынку ў складаназлучаным сказе.

Спосабы сувязі прэдыкатыўных частак складаназалежнага сказа. Знакі прыпынку ў складаназалежным сказе, у тым ліку ў сказе з некалькімі даданымі.

Адносіны паміж часткамі складанага бяззлучнікавага сказа. Знакі прыпынку ў складаным бяззлучнікавым сказе.

Знакі прыпынку ў складаным сказе з рознымі відамі сувязі частак.

Спосабы перадачы чужой мовы. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай.

ЛЕКСІКА. СТЫЛІСТЫКА

**Слова** як адзінка мовы. Лексічная спалучальнасць слоў. Лексічнае і граматычнае значэнне слова. Адназначныя і мнагазначныя словы. Амонімы. Размежаванне аманіміі і мнагазначнасці. Сінонімы. Антонімы.

Устойлівыя выразы — фразеалагізмы, перыфразы.

Паняцце пра тэкст. Віды і сродкі сувязі сказаў у тэксце. Тыпы тэкстаў.

Функцыянальныя стылі беларускай мовы. Жанры стыляў.

Паняцце пра стылістычную норму

## Трэніровачны тэст № 1

# ФАНЕТЫКА І АРФАЭПІЯ

**А1. Адзначце словы, вымаўленне і напісанне якіх супадае:**

1) разьбяр, 2) скібіна,
3) смех, 4) сядзьце,
5) ураджай.

Выконваючы заданні **А1 – А4,** трэба ўлічваць: 1) некаторыя спалучэнні могуць абазначаць адзін гук (*гара**дс**кі, су**ддз**я*); 2) адна літара можа абазначаць два гукі (***я**блык, здаро**ўе***); 3) свісцячыя зычныя перад мяккімі (апрача [г], [к'], [х']) памякчаюцца; 4) на пісьме асіміляцыя зычных не перадаецца (*мые**шся**, мала**ць**ба, пя**сч**аны*).

**А2. Адзначце словы, вымаўленне і напісанне якіх не супадае:**

1) без бацькі, 2) ткацкі,
3) усміхаешся, 4) згінуў,
5) камандзір.

**А3. Адзначце словы, у якіх аднолькавая колькасць гукаў і літар:**

1) радасць, 2) выяўленчы,
3) выкананне, 4) сейбіт,
5) папялішча.

Каб правільна выканаць заданні **А3 – А4**, трэба ведаць, што фанетычнае падаўжэнне перадаецца на пісьме падваеннем адпаведных літар. Такім чынам, пішацца дзве літары, а вымаўляецца адзін падоўжаны гук.

**А4. Адзначце словы, у якіх літар больш, чым гукаў:**

1) барацьбіт, 2) людскі,
3) пераязджаць, 4) пад'ехаць,
5) салаўіны.

**А5. Адзначце словы, у якіх спалучэнне *дз* абазначае адзін гук:**

1) садзейнічаць, 2) адзвінець,
3) падземны, 4) падзагаловак,
5) пэндзаль.

Выконваючы заданні **А5 – А6**, неабходна мець на ўвазе: два гукі гэтыя спалучэнні абазначаюць на стыку прыстаўкі (яна заканчваецца на ***д***) ***і*** кораня, які пачынаецца з літары ***з*** або ***ж.***

**А6. Адзначце словы, у якіх спалучэнне *дж* абазначае два гукі:**

1) агароджа, 2) дажджлівы,
3) аджыць, 4) паджаць,
5) аджартавацца.

**А7. Адзначце словы, у якіх літара *я* абазначае два гукі:**

1) песня, 2) ястраб,
3) паядынак, 4) сняданак,

5) пад’язны.

Заданні **А7 – А8**. Ётавыя галосныя ***е, ё, ю, я,*** а ткасама ***і*** абазначаюць два гукі: 1) у пачатку слова; 2) пасля галоснага; 3) пасля ***й, ў,*** мяккага знака і апострафа.

**А8. Адзначце словы, у якіх літара *ё* абазначае адзін гук:**

1) вясёлы, 2) ёмісты,
3) медальён, 4) куп’ё,
5) булён.

**А9. Адзначце словы, у якіх два мяккія зычныя:**

1) дзверы; 2) у таварыстве;
3) смех; 4) згінуў;
5) ялі́нка.

Варта звяртаць увагу вучняў на словы з асімілятыўнай мяккасцю (тыпу ***смех, бярэзнік,*** але: *скеміць, збіць, схіліць* ). Многія вучні “не бачаць” мяккіх зычных у словах тыпу *ёд, краіна, яліна* ([**й**од], [кра**й**іна], [**й**ал’іна]).

**А10. Адзначце словы, у якіх адбываецца прыпадабненне глухіх зычных да звонкіх:**

1) лёгка, 2) барацьба,
3) футболка, 4) хрэсьбіны,

5) аддзяленне.

**А11. Адзначце словы, у якіх адбываецца прыпадабненне шыпячых зычных да свісцячых:**

1) перавозчык,
2) аддаляешся,
3) расчырванелы,
4) па сцежцы,
5) у печцы.

**А12. Адзначце словы, у якіх адбываецца прыпадабненне свісцячых зычных да шыпячых:**

1) счапіць,
2) перавозчык,
3) зжаць,
4) пераможца,
5) па кладачцы.

**А13. Адзначце словы, у якіх адбываецца прыпадабненне звонкіх зычных да глухіх:**

1) грэбці,
2) малацьба,
3) медзь,
4) падпяваць,
5) дзядзька.

**А14. Адзначце словы, у якіх вымаўляецца падоўжаны гук *[ц]*:**

1) (у) палацы,
2) (у) спрэчцы;
3) (на) кветцы,
4) жыццё,
5) (на) дзежцы.

Гл. матэрыял у табліцах "Нормы вымаўлення некаторых зычных гукаў" і "Нормы вымаўлення некаторых спалучэнняў зычных гукаў". Акрамя таго, трэба адрозніваць гукі мяккія і цвёрдыя. Так, [ц] і [ц'] — розныя гукі, параўнайце: *у бо[ц]ы – бага[ц]е.*

**А15. Адзначце двухскладовыя словы:**

1) мурог,
2) фае,
3) аазіс,
4) вайна,
5) соус.

**А16. Адзначце словы, якія правільна падзелены на склады:**

1) а-ба-вя-зак,
2) баль-зам,
3) а-тлас,
4) кро-пка,
5) ав-і-яц-ыя.

**А17. Адзначце радкі, дзе абедзве падкрэсленыя галосныя з'яўляюцца націскнымі:**

1) вусы, прадзед,
2) гусценькі, скала,
3) каменны, сівізна,
4) прыняць, прыняты,
5) здаўна, спагада.

Заданні **А17 – А20.** Гэта заданне, як паказвае вопыт цэнтралізаванага тэсціравання, было і застаецца адным з самых складаных. Праблема ў тым, што нерэальна вывучыць вымаўленне ўсіх слоў. Таму вялікае значэнне набывае пастаянная, сістэматычная праца настаўніка па фарміраванню ў вучняў умення правільна ставіць націск у словах (захоўваць акцэнталагічныя нормы беларускай мовы).

**А18. Адзначце словы, у якіх няправільна пастаўлены націск:**

1) грамадзяні́н, 2) цяжкí,
3) крапівá, 4) кáменны,
5) выпáдак.

**А19. Адзначце радкі, у якіх усе падкрэсленыя галосныя абазначаюць націскныя гукі:**

1) інд<u>у</u>стрыя, з<u>а</u>кід, 2) за<u>е</u>чы, касц<u>я</u>ны,
3) сп<u>і</u>на, кам<u>е</u>ль, 4) р<u>ы</u>хліць, рыхл<u>е</u>нне,
5) з<u>а</u>светла, кв<u>е</u>тнік.

**А20. Адзначце словы з другім націскным складам:**

1) маленькі, 2) бульбяны,
3) адзінаццаць, 4) жальба,
5) гліняны.

**В1. Запішыце словы, якія вымаўляюцца так:**

*[п’ашчаны], [б’арэз’н’ік].*

**В2. Знайдзіце слова, у якім адбываецца прыпадабненне свісцячага да шыпячага. Запішыце, як вымаўляецца гэта слова.**

1) кніжка, 2) (на) дошцы,
3) лічба, 4) расчасала,
5) шчасце.

## Трэніровачны тэст № 2
## АРФАГРАФІЯ

**А1. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *ё*:**

1) ідэ..лаг, 2) кі..ск,
3) патры..т, 4) ма..р,
5) акардэ..н.

**А2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *э:***

1) эф..кт, 2) інж..нер,
3) ас..нсаванне, 4) р..льеф,
5) ац..ньваць.

**А3. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *о:***

1) дэп.., 2) гл..таць,
3) рады.., 4) дэк..рацыя,
5) Токі.. .

**А4. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *е:***

1) перас..ленец, 2) с..ржант,
3) аб..ліск, 4) Ад..са,
5) Х..рсон.

**А5. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *я:***

1) гені..льны, 2) фе..рверк,
3) афіцы..нт, 4) по..с,
5) с..мнаццаць.

**А6. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *а:***

1) світ..р, 2) лод..р,
3) в..льналюбівы, 4) шніц..ль,
5) р..монт.

**А7. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *я*:**

1) вас..мнаццаць, 2) в..снушкаваты,
3) кал..ндар, 4) дзе..ч,
5) кал..ктыў.

**А8. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *о:***

1) мн..газначны, 2) п..ўнаметражны,
3) ч..рнабровы, 4) д..ўгавечны,
5) ст..тысячны.

**А9. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *а*:**

1) выс..карослы, 2) д..ўгачаканы,
3) др..бналісты, 4) выс..кагорны,
5) кар..ткачасовы.

**А10. Адзначце словы, у трэба ўставіць літару *я*:**

1) хвал..падобны, 2) пуц..водны,
3) земл..робства, 4) сво..асаблівы,
5) вол..выяўленне.

**А11. Адзначце словы, у якіх трэба ўставіць літару *е*:**

1) пуц..ўкладчык, 2) жыцц..сцвярджальны,
3) жыцц..дзейнасць, 4) два..борства,
5) вугл..прамысловы.

**А12. Адзначце словы, дзе няправільна ўстаўлены выдзеленыя літары:**

1) чырв**а**наногі (бусел) — чырв**о**нагаловік,
2) д**о**ўгахвосты — д**а**ўгажыхар,
3) шыр**о**каплечы — шыр**а**каэкранны,
4) п**о**літэхнічны — п**а**лікліініка,
5) ст**а**годдзе — ст**о**метроўка.

**А13. Адзначце словы, дзе трэба ўставіць літару *я*:**

1) стэрэ..фільм, 2) відэ..сігнал,
3) аві..лінія, 4) бі..графія,
5) рады..аматар.

**А14. Адзначце словы, дзе трэба ўставіць літару *а*:**

1) мікр..схемы, 2) пр..цілеглы,
3) ст..гадовы, 4) шт..гадовы,
5) аўт..інспекцыя.

**А15. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *і*:**

1) не..маверны, 2) аб..шоў,
3) транс..ранскі, 4) звыш..нтэлект,
5) за..нелае дрэва.

**А16. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *й*:**

1) пры..шла, 2) абы..шоў,
3) за..нтрыгоўваць, 4) пера..манне,
5) вы..граны.

**А17. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *ы*:**

1) спад..спаду, 2) без..дэйны,
3) звыш..мклівы, 4) раз..грацца,
5) дэз..нфармацыя.

**А18. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца прыстаўная літара:**

1) па..уцінне, 2) ..учора,
3) ..удзіць, 4) ..узор,
5) трох..угольнік.

**А19. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску няма прыстаўной літары:**

1) старая ..львіца, 2) на ..мшысты дол,
3) вырабы з ..льну, 4) за..мглёнае акно,
5) луста ..ржанога хлеба.

**А20. Адзначце словы, у напісанні якіх дапушчана памылка:**

1) вугальны, 2) вугнаенне,
3) няма ільгот, 4) шэрая імгла,
5) вокаімгненна.

**А21. Адзначце словы, у якіх пішацца літара *у*:**

1) па_за, 2) со_с,
3) мароза_стойлівы, 4) ва _нівермагу,
5) За_ра́лле.

**А22. Адзначце словы, у якіх пішацца літара *ў*:**

1) Люблінская _нія, 2) па_зком,
3) Янка Ма_р, 4) рака _шача,
5) накіраваць на _льтрагук.

**А23. Адзначце словы, у якіх пішацца *мяккі знак:***

1) ін_шы, 2) італ_янскі,
3) барац_біт, 4) калос_се,
5) лёген_ка.

**А24. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску ставіцца *апостраф*:**

1) любоў..ю, 2) прэм..ера,
3) раз..яднаць, 4) ін..екцыя,
5) лас..ён.

**А25. Адзначце словы, у якіх мяккі знак не пішацца:**

1) восем..сот, 2) ц..вёрдасць,
3) падз..ме, 4) фантан..чык,
5) дзевяц..сот.

**А26. Адзначце словы, у якіх прапушчана літара:**
1) брэс..кі, 2) кіргі..скі,
3) капус..ны, 4) рос..тань,
5) бес..ардэчны.

**А27. Адзначце словы, у якіх дапушчана памылка:**
1) каллектыў, 2) прыгожая панна,
3) рашчапіць вагоны, 4) капусны ліст,
5) солнца.

**А28. Адзначце словы, у якіх нічога ўстаўляць не трэба:**
1) міласэр..насць, 2) поз..на,
3) ра..злаваць, 4) кантрас..ны,
5) палé..скі.

**А29. Адзначце словы, якія пішуцца разам:**
1) горка_салёны, 2) мікра_клімат,
3) контр_разведка, 4) паў_Мінска,
5) усходне_славянскі.

**А30. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:**
1) медна_стволы, 2) зялёна_аксамітны,
3) супраць_леглы, 4) метэа_зводка,
5) паў_Амерыкі.

**А31. Адзначце словы, якія пішуцца асобна:**
1) дыяметральна_супрацьлеглы, 2) высока_эфектыўны,
3) першабытна_абшчынны, 4) дастаткова_вядомы,
5) абсалютна_спакойны.

**А32. Адзначце словы, якія напісаны правільна:**
1) заходне-еўрапейскія краіны, 2) праца-здольнае насельніцтва,
3) ціхаакіянскае цячэнне, 4) прэм’ер-міністр,
5) светлакарыневыя валасы.

**А33. Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары:**
1) (А,а)ндрэева шапка, 2) (К,к)упалавы паэмы,
3) (Б,б)ыкаўскія героі, 4) (Н,н)алібоцкая пушча,
5) (К,к)аменны век.

**А34. Адзначце словы, якія пішуцца з малой літары:**

1) (у,У)сходнія славяне, 2) Мар'іна (г,Г)орка,
3) (д,Д)октар навук, 4) (н,Н)обелеўская прэмія,
5) трагедыя (х,Х)ерасімы.

**А35. Адзначце словы, якія напісаны правільна:**

1) Каложская Царква, 2) беларускія краявіды,
3) багдановічаў санет, 4) Купалаўскія мясціны,
5) Сусветны дзень моладзі.

**В1. Выпішыце слова, у якім прапушчана літара *і*:**

1) с_грацъ, 2) за_чаняты,
3) за_малася, 4) вы_шлі,
5) за_скрыцца.

**В2. Знайдзіце слова, у якім дапушчана памылка, і запішыце яго правільна.**

Кацер мчаў на ўсю сілу, разразаючы суровыя хвалі і передранішнюю цемру.

**В3. Выпішыце слова, напісанае правільна:**

1) зайздростна, 2) ежджу,
3) пяшчаны, 4) праязны,
5) нісчымны.

**В4. Знайдзіце слова, у якім дапушчана памылка, і запішыце яго правільна:**

1) спазніцца, 2) лабаранцкі,
3) кантрастны, 4) міласэрнасць,
5) хрустнуць.

## Трэніровачны тэст № 3
# СКЛАД СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ

**А1. Адзначце словы, будова якіх адпавядае схеме “прыстаўка + корань+суфікс + канчатак”:**

1) бязрыбны, 2) бязрукі,
3) бязродны, 4) бязлюдны,
5) бязлі́сты.

**А2. Адзначце словы, будова якіх адпавядае схеме “прыстаўка + корань+ канчатак”:**

1) пасінелы, 2) памыўся,
3) паціху, 4) бездараж,
5) памыць.

Трэба ўлічваць, што нязменныя словы і формы канчаткаў не маюць. Такія словы трэба азрозніваць ад тых, што маюць нулявы канчатак.

**А3. Адзначце словы, аснова якіх складаецца з кораня і суфікса:**

1) напісаны, 2) гуллівы,
3) вычытаць, 4) вечаровы,
5) бялізна.

**А4. Адзначце рады, дзе запісаны аднакаранёвыя (роднасныя) словы:**

1) вада — вадою, 2) падводны — падводнік,
3) водны — вадзяны, 4) вада — вадзе,
5) вада — водны.

**А5. Адзначце рады, дзе запісаны формы аднаго слова:**

1) зялёны — зеляніна, 2) зялёны — зялёная,
3) зялёная — зялёныя, 4) зялёны — пазелянець,
5) пазелянець — пазелянелы.

**А6. Адзначце роднасныя (аднакаранёвыя) словы:**

1) агарод, 2) гара,
3) загар, 4) гарыстаць,
5) узгорак.

**А7. Адзначце словы, якія не ўваходзяць у рад аднакаранёвых слоў:**

1) гімнаст, 2) гімнастыка,
3) гімназія, 4) гімнастычны,
5) гімн.

**А8. Адзначце словы з нулявым канчаткам:**

1) беразняк, 2) вільготнасць,
3) паказаць, 4) купэ,
5) цёпла.

**А9. Адзначце словы, якія не маюць канчатка:**

1) прыбор, 2) абыякавасць,
3) галопам, 4) удалечыні,
5) усміхаючыся.

**А10. Адзначце нязменныя словы (формы):**

1) кіно, 2) бервяно,
3) гледзячы, 4) па-мойму,
5) галіфэ.

**А11. Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:**

1) перакрычаць, 2) зблізку,
3) збор, 4) узаконіць,
5) аднавясковец.

**А12. Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам:**

1) шырыня, 2) блізка,
3) цёплы, 4) спераду,
5) ракетабудаўнік.

**А13. Адзначце словы, утвораныя прыставачным спосабам:**

1) непарадак, 2) дакруціць,
3) зборны, 4) збочыць,
5) ніхто.

**А14. Адзначце словы, утвораныя постсуфіксальным спосабам:**

1) асіннік, 2) маладосць,
3) параіцца, 4) хто-небудзь,
5) радуючыся.

**А15. Адзначце словы, утвораныя бяссуфіксным спосабам:**

1) прылёт, 2) чырвоны,
3) клятва, 4) заплыў,
5) скрып.

**А16. Адзначце рады, дзе правільна паказана, як утварыліся словы:**

1) дабрыня ← добры (*суфіксальны спосаб*),

2) восень ← асенні (*прыставачна-суфіксальны спосаб*),

3) выраб ← вырабляць (*бяссуфіксны спосаб*),
4) выгуляцца ← гуляць (*прыставачна-постфіксальны спосаб*),
5) вывучаны ← навука (*прыставачна-суфіксальны спосаб*).

**А17. Адзначце выпадкі, калі пры ўтварэнні патрэбнай формы адбываецца чаргаванне заднеязычных зычных гукаў са свісцячымі:**

1) трава на (луг),
2) ісці ў адну (дарога),
3) расці пры (сцежка),
4) у госці да (цётка),
5) выпечка з (мука).

**А18. Адзначце словы, пры змяненні якіх адбываецца чаргаванне галосных:**

1) паркаль,
2) бор,
3) метро,
4) вучань,
5) кенгуру.

**А19. Адзначце выпадкі, калі пры ўтварэнні патрэбнай формы назоўніка адбываецца чаргаванне зычных гукаў:**

1) ісці па (вуліца),
2) стаяць на (вахта),
3) сказаць (сяброўка),
4) затрымацца па (дарога),
5) віднецца на (гара).

Пры змяненні і ўтварэнні слоў у каранях часта адбываецца чаргаванне гукаў. Найбольш пашыраныя чаргаванні галосных гукаў:

| | | |
|---|---|---|
| *о – а*<br>*э – а* | [о] – [а]<br>[э] – [а] | *возера – **а**зёры, г**о**рад – г**а**радскі;*<br>*рэкі – р**а**чны, цэгла — ц**а**гляны;* |
| *е – я* | [‘э] – [‘а] | *лес – л**я**сны, б**е**гаць – б**я**гу;* |
| *ё – я* | [‘о] – [‘а] | *с**ё**стры – с**я**стра, в**ё**сны – в**я**сна;* |
| *е – і* | [‘э] – [і] | *кв**е**тка – кв**і**тнець, св**е**тлы – св**і**танак;* |
| *е – а – о* | [‘э] – [а] – [о] | *н**е**сці – н**а**сіць – н**о**сіць, л**е**гчы – л**а**жыцца – л**о**гава;* |
| *о – у – ы* | [о] – [у] – [ы] | *с**о**хнуць – с**у**хі – зас**ы**хаць;* |
| *о – і – е – я* | [о] – [і] – [‘э] – [‘а] | *зб**о**р – зб**і**раць – выб**е**ру – заб**я**ру;* |
| *о, е, а* – нуль гука | [о], [‘э], [а] – [ø] | *с**о**н – сны, зб**о**р – забраць; дз**е**нь – дні, п**е**нь – пні; замоч**а**к – замочка* (бегласць галосных); |
| *ро – ры* | [ро] – [ры] | *кр**оў** – кр**ы**вавы, гр**ом** – гр**ы**мець;* |
| *ло – лы* | [ло] – [лы] | *гл**о**тка – гл**ы**таць,* |
| *ле (ля) – лі* | | *бл**е**ск (бл**я**ск) – бл**і**шчэць, бл**і**скавіца.* |

**А20. Адзначце словы, у якіх пры змяненні адбываецца бегласць галосных (чаргаванне [о], [э] з нулём гука):**

1) колас, 2) бабёр,
3) арол, 4) горад,
5) рука.

**А21. Адзначце назоўнікі, пры змяненні якіх у месным склоне адбываецца чаргаванне зычных у аснове слова:**

1) мястэчка, 2) сажалка,
3) слых, 4) раз’езд,
5) універсітэт.

Пры змяненні і ўтварэнні слоў у каранях могуць адбывацца чаргаванні зычных гукаў. Найбольш пашыраныя наступныя чаргаванні:

[г] — [з], [ж]: *берагі — на беразе — беражок;*
[х] — [с’], [ш]: *страха — страсе, стрэшка;*
[к] — [ц], [ч]: *рука — руцэ — зручны;*
[з] — [ж]: *вязаць — вяжу, казаць — кажу;*
[с] — [ш]: *пісаць — пішу, касіць — кашу;*
[д] — [дз’] — [дж]: *хада — хадзіць — хаджу; погляды — паглядзець — пагляджу;*
[т] — [ч] — [ц]: *святло — свячу — свяціць;*
[ст] —[шч]: *рост — вырошчваць, мост — намошчаны;*
[ск] — [шч]: *паласкаць — палашчу, плоскі — плошча;*
[б’] — [бл’], [п] — [пл’]: *любіць — люблю, сыпаць — сыплю, кпіць — кплівы*
[м] — [мл], [в] — [ўл]: *карміць — кармлю, лавіць — лаўлю.*

**А22. Адзначце выпадкі правільнага чаргавання ў аснове слова:**

1) вавёрка — вавёрке, 2) чаромха — на чаромсе,
3) кветка — на кветцы, 4) сцяг — на сцязе,
5) чарга — па чарзе.

**В1. Знайдзіце слова (словы), пры змяненні якіх адбываецца чаргаванне зычных у аснове. Запішыце адпаведную форму гэтага слова (слоў).**

1) вуха — па ..., 2) каваль — пры ...,
3) падручнік — у ..., 4) задуха — у ... .
5) бег — на ... .

# МАРФАЛОГІЯ І КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ

У тэставых заданнях ў мінулыя гады па тэмах раздзела «Марфалогія» прапаноўвалася каля 12 заданняў (30% ад агульнай колькасці). Традыцыйна выносяцца заданні па наступных тэмах:

- напісанне склонавых канчаткаў назоўнікаў;
- ужыванне роду і ліку назоўнікаў;
- ужыванне займеннікаў і лічэбнікаў і правапіс склонавых форм займеннікаў і лічэбнікаў;
- ужыванне ступеняў параўнання прыметнікаў і прыслоўяў;
- правапіс асабовых канчаткаў дзеясловаў;
- ужыванне і правапіс дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў;
- правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў;
- ужыванне і правапіс ***не (ня), ні*** з рознымі часцінамі мовы.

Веды па ўсіх тэмах, якія вывучаюцца ў раздзеле “Марфалогія”, звычайна правяраюцца заданнямі як закрытага (А), так і адкрытага (В) тыпу. Якi характар могуць мець гэтыя заданні, разгледзім на канкрэтных прыкладах.

.

## Трэніровачны тэст № 4

# НАЗОЎНІК

**А1. Адзначце словазлучэнні, у якіх назоўнікі маюць канчатак *–у (-ю)*:**

1) камандзір батальён_, 2) жыве каля парк_,
3) быць у рэзерв_, 4) прыгожы з твар_,
5) старонкі тэкст_.

**А2. Адзначце словазлучэнні, у якіх назоўнікі маюць канчатак *–ы***

1) у абноўц_, 2) пры банкір_,
3) у экіпаж_, 4) на гар_,
5) у возер_.

**А3. Адзначце словазлучэнні, у якіх назоўнікі маюць канчатак *–е*:**

1) у гастраном_, 2) у ліпен_,
3) на вяршын_, 4) у школ_,
5) па снез_.

**А4. Адзначце спалучэнні, у якіх назоўнікі маюць канчатак *–э*:**

1) на (трактар), 2) пры (муж),
3) па (шчака), 4) у (малако),
5) пры (дачка).

**А5. Адзначце словазлучэнні, у якіх назоўнікі маюць канчатак *і:***

1) у карагодз_, 2) у кніз_,
3) на кан_, 4) у верасн_,
5) пры кавал_.

**А6. Адзначце назоўнікі мужчынскага роду:**

1) ранцье, 2) таксі,
3) фламінга, 4) Тбілісі,
5) Кіліманджара.

**А7. Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчаны памылкі ў вызначэнні роду назоўнікаў:**

1) высокая таполя, 2) трамвайны дэпо,
3) жоўценькі кураня, 4) багаты буржуа,
5) з ціхоняй Зайцавым.

**А8. Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчаны памылкі ў вызначэнні ліку назоўнікаў:**

1) цёплыя панчохі, 2) грэчневая крупа,
3) зламаныя голлі, 4) раптоўны замаразак,
5) прыгожыя краявіды.

**А9. Адзначце назоўнікі, якія не маюць формы множнага ліку:**

1) сукенка, 2) прадзіва,
3) вятрак, 4) малацьба,
5) слых.

**А10. Адзначце назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку:**

1) завушніцы, 2) сумёты,
3) весніцы, 4) суседзі,
5) зеляніна.

**А11. Адзначце сказы з граматычнымі памылкамі:**

1) У вітрыне магазіна павел Сцяпанавіч убачыў прыгожы кашнэ.
2) У кутку вялікага клубнага зала адзінока стаяла старое піяніна.
3) Дзядуля прынёс у хату вялізны ахапак сухіх сасновых дроў.
4) Раман набраў поўныя прыгаршчы малін.
5) Аперацыю рабіў вядомы хірург Ткачова.

**А12. Адзначце назоўнікі з ненарматыўнымі канчаткамі:**

1) рамонт з гарантыей, 2) укладка асфальту,
3) група партызан, 4) у квяцістай хустке,
5) восем гадоў.

**В1. Знайдзіце словазлучэнне, у якім дапушчана памылка ва ўтварэнні формы назоўніка. Запішыце словазлучэнне правільна.**

1) безліч гнёздаў, 2) група грамадзян,
3) стос кнігаў, 4) некалькі салдатаў,
5) з пяці школ.

**В2. Знайдзіце спалучэнне з памылкай у напісанні склонавай формы назоўніка. Запішыце слова правільна (у той форме, у якой яно ўжываецца ў сказе).**

1) сказаць сяброўцы Тані, 2) перадаць цётцы,
3) з сябрам Пецей, 4) з Аляксеем Пятровічам,
5) дапамагчы бацьку.

## Трэніровачны тэст № 5

# ПРЫМЕТНІК

**А1. Адзначце прыметнікі, якія ўтвараюць ступені параўнання:**

1) высокі,
2) разумная
3) жанаты,
4) васільковы,
5) дрэнны.

**А2. Адзначце сказы, дзе правільна ўтворана ступень параўнання прыметніка:**

1) Ён падумаў, што гэта будзе больш карацейшая дарога.
2) Раніцай грыбы самыя моцныя і свежыя.
3) Няма пачуцця мацней за каханне.
4) Шчасце гэтага лета было самае вялікае шчасце іх жыцця.
5) Найвышэйшая ўлада на свеце — матчына.

**А3. Адзначце сказы з граматычнымі памылкамі:**

1) Вася ўжо вялікі, вышэй бацькі нават.
2) Самай найцяжэйшай была дарога праз горны перавал.
3) Кажуць, што ў дрэў крона каранёў ледзь не ўдвая больш за крону, якую мы бачым.
4) Цяжкі наш хлеб ад лёсу не прасі ты лягчэйшага. Лягчэйшага — няма.
5) Сястра старэйшая Пецю на два гады.

**А4. Адзначце прыметнікі, у якіх пішацца адна літара *н*:**

1) алавян_ы,
2) арлін_ы,
3) камен_ы,
4) сцюдзён_ы,
5) бетон_ы.

**А5. Адзначце прыметнікі, у якіх трэба ўставіць яшчэ адну літару *н*:**

1) глінян_ы,
2) клятвен_ы,
3) ваен_ы,
4) пясчан_ы,
5) палымян_ы.

**А6. Адзначце словазлучэнні, у якіх прыналежныя прыметнікі ўтвораны правільна:**

1) матчыны рукі,
2) дочана кніга,
3) Петрусёў бацька,
4) Сцёпкіна паліто,
5) Алесеў сябар.

**B1. Знайдзіце сказ з памылкай ва ўжыванні ступені параўнання прыметніка. Запішыце правільную форму слова.**

1) Міколкаў кошык паўней, чым у яго сябра.
2) Няма больш смачнай вадзіцы, як з роднай крыніцы.
3) Дзед і бацька прывучылі берагчы хлеб, шанаваць самы маленькі кавалачак.
4) А найлепшая тая дарога, што вядзе на бацькоўскі парог.
5) Гэту задачу можна рашыць больш простым спосабам.

**B2. Знайдзіце сказ з памылкай ва ўжыванні ступені параўнання прыметніка. Запішыце спалучэнне правільна.**

1) Няма на свеце прыгажэйшага і мілейшага краю, чым той, дзе ты нарадзіўся.
2) А найпрыгажэйшае лісце бывае восенню на асінах.
3) Андрэй быў куды меншы за мяне ростам.
4) У быка правы рог ніжэй левага.
5) Час — найлепшы лекар.

**B3. Знайдзіце словазлучэнне, у якіх дапушчана граматычная памылка. Запішыце яго правільна.**

1) у сіняй сукенцы,
2) ранішняе сонца,
3) у дарагом касцюме,
4) па жоўтым лісці,
5) да суседняга дома.

**B4. Знайдзіце словазлучэнні, у якіх няправільна ўтвораны прыналежныя праметнікі. Запішыце правільную форму прыметнікаў.**

1) буслава гняздо,
2) Алёшыва жыццё,
3) Пецева маці,
4) Ігарыў дзённік,
5) дзедаў пляменнік.

**B5. Знайдзіце прыметнік (прыметнікі), у якім (якіх) дапушчана арфаграфічная памылка. Запішыце слова (словы) правільна.**

1) навагрудскі,
2) адвакацкі,
3) латышскі,
4) сусецкі,
5) салдатскі.

## Трэніровачны тэст № 6

# ЗАЙМЕННІК

**А1. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба ўжыць займеннік *сабе*:**

1) Усім сябрам ты не дагодзіш, а толькі сам __ нашкодзіш.
2) Поплаў краскамі прыбраўся яркімі, кліча ў госці да __ здалёк.
3) Лес, што акружае вёску, сам па __ невялікі, але надзвычай густы.
4) Чаго ___ не жадаеш, таго і другому не зыч.
5) Сам ад ___ не пабяжыш упрочкі, ___ самога цяжка перагнаць.

Неабходна ўмець размяжоўваць формы зваротнага займенніка *сябе*: родны склон (каго? чаго?) — ***сябе,*** давальны і месны склон (*пры* кім? чым?) — ***сабе***.

**А2. Адзначце сказы з памылкай ва ўжыванні або напісанні займенніка:**

1) Сусед Васіля, калі ён параўняўся з ім, адразу загаварыў.
2) Сапраўднаму рыбаку не трэба тое, што само даецца ў рукі.
3) З усходняга боку віецца паўз возера дарога, абапал яе высяцца сосны-веліканы.
4) Я сёння бачыў тваяго бацьку.
5) Побач з домам быў сад. Ён пазіраў на вуліцу пяццю вокнамі.

**А3. Адзначце радкі, дзе трэба ўставіць займеннік *цябе*.**

1) сустрэў ___ на вуліцы, 2) гляджу ___ ў вочы,
3) мы ўдзячны ___, 4) быў у ___ ў гасцях,
5) дазволь пасядзець каля ___ .

Трэба адрозніваць формы займенніка *ты*: родны склон — ***цябе,*** давальны і месны склон — ***табе***.

**А4. Адзначце сказы, дзе правільна ўжыты і запісаны займеннікі.**

1) Вецер даносіў галасы людзей, якія выходзілі з клуба.
2) Бацька папрасіў, каб сын прынёс свае кнігі.
3) Аказалася, што дзяўчына жыве ў нашэм доме.
4) На ўсходзе Нарач злучаецца вузкім пралівам між пясчаных кос з возерам Мястра, плошча якога — трынаццаць квадратных кіламетраў.
5) Памыйце рукі і ягады і пачынайце іх есці.

**А5. Адзначце сказы, дзе на месцы пропускаў трэба ўжыць займеннік *нехта*.**

1) __ наперад не знае, што каго чакае.
2) “Ой, цябе баіцца __!” – голасна адазвалася Марына.
3) “Нічога не відаць. Але __ ўсё ж павінен прысці”,– меркаваў Віталь.
4) З нас __ нахлебнікам прыроды не жадае быць.
5) Хтось палюе на сініцу, __ ловіць жураўля...

Варта навучыцца размяжоўваць няпэўныя і адмоўныя займеннікі. Няпэўныя выражаюць значэнне няпэўнасці, г.зн. указваюць на невядомыя асобы, няпэўныя прадметы, напрыклад: *нехта сказаў; нечы падручнік; некалькі чалавек.* Адмоўныя займеннікі выражаюць адсутнасць прадмета ці прыметы і ўжываюцца ў адмоўных сказах, напрыклад: *ніхто не прыйшоў; нікога няма; нічога не ўзяў.* У няпэўных прыстаўка ***не*** заўсёды пад націскам (*нехта, нешта, нейкі, нечы, некалькі*), у адмоўных не пад націскам заўсёды пішацца ***ні*** (*ніхто, нішто, ніякі, нічый, нікольні*).

**А6. Адзначце сказы з правільным ужываннем займеннікаў.**

1) Няхай сабе спытае кожны, ці пасадзіў ён дрэва ў жыцці.
2) Хто-небудзь з выпускнікоў тых гадоў на сустрэчу прыехаў.
3) Я табе не раз прапаноўваў перасяліцца ў наш край.
4) Мы табе шануем і моцна любім, родная матуля.
5) Калі народ сабе не паважае, не будуць паважаць яго іншыя народы.

**А7. Адзначце сказы з памылковым ужываннем займеннікаў.**

1) Дзед Талаш убачыў ваўка, але ён яго не спалохаўся.
2) Маці паклікала мяне і папрасіла наліць сабе кавы.
3) Сёй-той з хлопцаў час ад часу пазіраў у бок Марынкі.
4) У кожнага чалавека свой характар, сваё жыццё, і да яго трэба ўмець падысці.
5) Сумна хлопчыку. Няма з кім пагуляць, няма да каго схадзіць у госці, нават пагаварыць няма з кім.

**А8. Адзначце сказы, дзе на месцы пропускай трэба ўжыць займеннік *самая, самы.***

1) Цэрква стаяла пры ___ вёсцы.
2) У ___ вёсцы немцаў не было, але ў бліжэйшым лесе, казалі людзі, іх пахавалася нямала.
3) Нават ____ нязначнага павеву ветру не адчувалася ў лесе.
4) Я атрымаз дазвол ад ___ дырэктара.
5) Каля ____ берага б’е з-пад зямлі крыніца з серабрыстай сцюдзёнай вадой.

Трэба адрозніваць займеннікі ***сам (сама, само, самі)*** і ***са́мы (са́мая, са́мае, самыя)***, якія маюць адрозненні ва ўсіх склонах.

| | Адз.лік. | | Мн.лік | Адз.лік | | Мн.лік |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **м. і н.р.** | **ж.р.** | | **м. і н.р.** | **ж.р.** | |
| **Н.** | *сам, само* | *сама* | *самі* | *са́мы, са́мае* | *са́мая* | *са́мыя* |
| **Р.** | *Самога* | *самой* | *саміх* | *са́мага* | *са́май* | *са́мых* |
| **Д.** | *Самому* | *самой* | *самім* | *са́маму* | *са́май* | *са́мым* |
| **В.** | як Н. або Р. | | | | | |
| **Т.** | *Самім* | *самой* | *саміх* | *са́мым* | *са́май* | *са́мымі* |
| **М.** | *Самім* | *самой* | *саміх* | *са́мым* | *са́май* | *са́мых* |

**В1. Знайдзіце сказ з памылкай ва ўжыванні займенніка. Запішыце займеннік, які трэба ўжыць у сказе.**

1) Я чую, як нехта гаворыць
2) У каго-небудзь ёсць запалкі?
3) Купі мне што-небудзь у буфеце.
4) Давай паглядзім які-небудзь фільм.
5) Хтосьці, дапамажыце!

# Трэніровачны тэст № 7

## ЛІЧЭБНІК

**А1. Адзначце лічэбнікі, у якіх пішацца літара *е*:**

1) с..мдзесят, 2) с..мюстамі,
3) дзес..цера, 4) дз..вяты,
5) дзес..церых.

**А2. Адзначце лічэбнікі, у якіх на месцы пропуску пішацца мяккі знак:**

1) дзевяц..сот, 2) дз..вюм,
3) (у) вас..мі, 4) шас..цісоты,
5) сем.. .

**А3. Адзначце лічэбнікі, у якіх пропуску пішацца дзве літары *цц*:**

1) пятна..аць, 2) пя..ю,
3) два..аць, 4) дзевя..ю,
5) пя..істам.

**А4. Адзначце лічэбнікі, у якіх пішацца літара *а*:**

1) за двум.. зайцамі, 2) тры в..сьмых,
3) (на) двухст..х старонках, 4) (у) дв..іх кацянят,
5) в..семсот метраў.

**А5. Адзначце сказы, у якіх парушаны граматычныя нормы беларускай мовы:**

1) Пяць доўгіх вёрстаў вельмі стамілі нашых падарожнікаў.
2) Тры пятых соткі агарода былі засаджаны памідорамі.
3) Каля двух гадзін давялося чакаць цягніка на Гомель.
4) Трое ладных падсвінкаў гадавалася ў гэтым годзе ў бацькавым хляве.
5) Больш за паўтары месяцы не было навін з фронту.

**А6. Адзначце лічэбнікі, якія пішуцца разам:**

1) трыста_сорак, 2) дзевяць_сот,
3) пяці_дзесяты, 4) трох_тысячны,
5) дзвесце_дваццаць.

**А7. Адзначце лічэбнікі, якія запісаны правільна:**

1) паўтара кілаграма, 2) пяцьдзесятыя гады,
3) шасцісот грамаў, 4) васьмюдзесяццю цэнтнерамі,
5) двумястамі ўдзельнікамі.

**А8. Адзначце лічэбнікі, запісаныя няправільна:**

1) сямьюдзесяццю працэнтамі, 2) васьмы рад,
3) пяць восьмых частак; 4) трымястамі рублямі,
5) двумастамі чатырма ўдзельнікамі.

**А9. Адзначце словазлучэнні, у якіх ужываюцца зборныя лічэбнікі:**

1) 3 (салдаты), 2) 5 (гусі),
3) 9 (лісяняты), 4) 4 (жанчыны),
5) 2 (дубы).

**В1. Знайдзіце словазлучэнне з памылкай у напісанні лічэбніка. Запішыце лічэбнік правільна.**

1) дваццаццю сямю турыстамі, 2) пяцьсоты спартсмен,
3) абедзве дзяўчыны, 4) тры чацвёртыя ўраджаю,
5) з трымастамі сарака пяццю рублямі.

**В2. Знайдзіце сказ з памылкай ва ўжыванні лічэбніка. Запішыце правільна спалучэнне “лічэбнік + назоўнік”.**

1) На ганку забаўляліся чацвёра кацянят.
2) У хату ўвайшлі двое салдат.
3) Трое жанчын дапамаглі маці выкапаць бульбу.
4) Дзевяцера маіх аднакласнікаў збіраюцца паступаць у медыцынскую акадэмію.
5) Нас было пяцёра.

## Трэніровачны тэст № 8

# ДЗЕЯСЛОЎ

**А1. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага часу маюць канчатак *–еце*:**

1) дапамагаць, 2) казаць,
3) есці, 4) перабягаць,
5) непакоіць.

Каб правільна выканаць заданні **А1 – А13,** трэба адпрацаваць алгарытм выбару асабовых канчаткаў дзеяслова (гл. стар 28).

**А2. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 3-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага часу маюць канчатак *–уць (-юць)*:**

1) належаць, 2) пасвяціць,
3) зберагчы, 4) ненавідзець,
5) задумацца.

**А3. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга ці будучага часу маюць канчатак *–эш (-еш)*:**

1) занесці, 2) пісаць,
3) вырабляць, 4) бяліць,
5) біць.

**А4. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 1-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага часу маюць канчатак *–ом (-ём):***

1) несці, 2) даць,
3) браць, 4) рашаць,
5) ужываць.

**А5. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага часу маюць канчатак *–іце (-ыце)*:**

1) хацець, 2) вярцець,
3) перагнаць, 4) чытаць,
5) вырашаць.

**А6. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага часу маюць канчатак *–яце*:**

1) везці, 2) гаварыць,
3) слухаць, 4) здаваць,
5) вынесці.

**А7. Адзначце дзеясловы, якія ўжываюцца зканчаткамі *–аць, -яць* у форме 3-й асобы множнага ліку будучага часу.**

1) лезці, 2) занядбаць,
3) паставіць, 4) вызначыць,
5) разбурыць.

**А8. Адзначце дзеясловы, якія ўжываюцца з канчаткамі *–іць, -ыць* у форме 3-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу:**

1) хадзіць, 2) трымаць,
3) сачыць, 4) варыць,
5) паважаць.

**А9. Адзначце дзеясловы, якія ўжываюцца з канчаткамі *–аце, -яце* ў форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга часу:**

1) класці, 2) успамінаць,
3) цярпець, 4) жаць
5) рэзаць.

**А10. Адзначце дзеясловы, якія ўжываюцца з канчаткамі *–еш, -аш, -эш* у форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу:**

1) апранаць, 2) вярцець,
3) залежаць, 4) пісаць,
5) браць.

**А11. Адзначце дзеясловы, якія ўжываюцца ў форме 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку цяперашняга ці будучага часу з канчаткамі *–еш, -еце*:**

1) ты (чакаць) званка, 2) вы (рабіць) паслугу,
3) вы (наведаць) хворага, 4) ты (непакоіцца) пра бабулю,
5) ты (даручаць) сябру.

**А12. Адзначце цяперашняга часу з няправільнымі асабовымі канчаткамі:**

1) мы едзем, 2) ён даець,
3) вы жывеце, 4) мы кладзем,
5) вы кладзяце.

**А13. Адзначце дзеясловы з нарматыўнымі асабовымі канчаткамі.**

1) мы сустракаем, 2) вы спяваеце,
3) мы рэжым, 4) вы мыяце,
5) яна шыець.

**А14. Адзначце дзеясловы, якія не маюць формаў цяперашняга часу:**

1) размаўляць, 2) дапамагчы,
3) асэнсаваць, 4) папрасіць,
5) бегчы.

Не маюць формаў цяперашняга часу дзеясловы закончанага трывання (адказваюць на пытанне *што зрабіць?)*. Параўн.: *размаўляць — размаўляю, размаўляем, размаўляе, размаўляюць; бегчы — бягу,бяжым, бяжыць, бягуць*. Дзеясловы *асэнсоўваць, дапамагаць, прасіць* таксама маюць форму цяперашняга часу: *асэнсоўваць — асэнсоўваю, асэнсоваем, асэнсоўвае, асэнсоўваюць* і г.д

**А15. Адзначце правільна ўтвораныя і запісаныя дзеепрыметнікі:**

1) прывезяны, 2) завострaны,
3) выпіхнуты, 4) знясілены,
5) загоенныя.

**А16. Адзначце словазлучэнні з формамі дзеепрыметнікаў, якія не адпавядаюць нормам беларускай мовы:**

1) спушчаны рукаў, 2) заснежаты падворак,
3) абсыпленая цветам, 4) забыліўшыйся абутак,
5) скошаная трава.

**А17. Адзначце словазлучэнні з нарматыўнымі формамі дзеепрыметнікаў:**

1) распрацаваны план, 2) спатнелы твар,
3) хвалюючыйся настаўнік, 4) грукочучы транспарцёр,
5) разбіты посуд.

**А18. Адзначце памылкова ўтвораныя або запісаныя формы дзеепрыметнікаў:**

1) адкрыўшаяся далеч, 2) дапрацаваны рукапіс,
3) выдаткаванныя грошы, 4) абжытыя мясціны,
5) сустракаемыя госці.

**А19. Адзначце сказы з формамі дзеепрыметнікаў, якія не адпавядаюць нормам беларускай мовы:**

1) Цёплы змрок вносіў з сабою на вольнае паветра з ачышчаючаю пыл вільгаццю і лёгкасць, і пах, і спакой.
2) Гойдалася верхавіна бярозы, адламаная ўчарашняй бурай.
3) У нейкім панылым маўчанні застылі кусты жаўцеючага алешніку.
4) Спеў салаўя, цешыўшый вуха, паплаў па-над рэчкай.
5) Пад страхою нашай хаты было ластаўчына гняздо, злепленае з ілу, прынесенага ў клювах птушкамі з маленькай сажалкі.

**А20. Адзначце сказы з формамі дзеепрыметнікаў, якія адпавядаюць нормам беларускай мовы:**

1) На сіяючым усходнім баку гарызонта паказалася сонца.
2) Між пясчаных узгоркаў, заслаўшых мохам ляжыць лагчына.
3) Праязджаючы селянін паварочвае ўбок уваходзячых у пакой.
4) Ад лугавых узгоркаў, выпаленых сонцам да попельнага колеру, дыхала сумным настроем восень.
5) Ёсць у мяне толькі скупыя ўскосныя звесткі, знойдзеныя даследчыкамі ў розных архівах.

**А21. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы нельга перакласці на беларускую мову адпаведнымі дзеепрыметнікамі:**

1) *видящий* далеко, 2) *тянувшаяся* вдоль берега,+\
3) *прочитанная* книга, 4) *изученные* свойства,
5) *разбитая* ваза.

**А22. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы можна перакласці на беларускую мову адпаведнымі дзеепрыметнікамі:**

1) *ответившая* на вопрос, 2) *недоспелые* ягоды,
3) *обутый* в сапоги, 4) *созданный* автором,
5) *держащийся* обеими руками.

**А23. Адзначце сказы з памылковым ужываннем дзеепрыслоўяў.**

1) Падыходзячы да школы, у хлопцаў узнікла спрэчка.
2) Па тратуарах, схаваўшы насы ў каўняры, праходзілі рэдкія прахожыя.
3) Зразумеўшы сваю нетактоўнасць, мужчына змоўк.
4) Даведаўшыся пра вызваленне Мінска, нас акрыліла надзея хутка вярнуцца ў родныя мясціны.
5) Доўга нахадзіўшыся па лесе, мне вельмі захацелася піць.

**А24. Адзначце сказы з нарматыўнымі формамі дзеепрыслоўяў.**

1) Чайка плануе ў паветры, выглядаючы сабе здабычу.
2) Дрэмле, прынікшы да шыбаў, ноч.
3) Седзя каля рэчкі, мне бачыліся абрысы Траецкага прадмесця.
4) Буслы кружылі ў сваім рытуальным карагодзе, благаслаўляя зямлю, што плыла пад іх белымі крыламі.
5) Раз-пораз адчыняючыся, пагрукваліі ў вагонах дзверы.

**А25. Адзначце сказы, у якіх дзеепрыслоўі ўжыты і ўтвораны правільна.**

1) Мужчыны павольна ішлі, узгадаўшы былыя партызанскія гады.
2) Бабуля, пачакаў хвілінку, наблізілася да толькі што адчыненага магазіна.
3) У восеньскім небе насіліся ластаўкі, гуртуючысь ляцець у далёкі вырай.
4) Ідзя ў лес, я пашкадаваў, ўто не ўзяў фотаапарат.
5) Шумела і пенілася вада, імкнучыся на вольны прастор.

**А26. Адзначце сказы з памылкай ва ўжыванні, утварэнні або напісанні дзеепрыслоўяў.**

1) Па голлі скачуць сінічкі, парушая піскам дрымучую цішыню.
2) Усадзіўшы косы ў мокрую ад расы траву, касцы ідуць снедаць.
3) Хаця я і адчуваў, што, запрасіўшы Рыгорку ўдзельнічаць у канцэрце, я зрабіў правільна, але цвёрдай упэўненасці ў гэтым не было.
4) Чуючы гэты востры боль у кожнай песні, верылася, што нічога на свеце не знікае без следу.
5) Лісце, кружачыся ў паветры, мякка сцелецца на зямлю.

**А27. Адзначце дзеепрыслоўі, перакладзеныя правільна.**

1) подобрав – падабраўшы, 2) боясь – баючысь,
3) держа – трымая, 4) улыбаясь – усміхаючыся,
5) мечтая – марачы.

**В1. Знайдзіце дзеясловы з ненарматыўнымі асабовымі канчаткамі. Запішыце правільную форму дзеясловаў.**

1) ён кажа, 2) яна клеець,
3) ты пішэш, 4) вы жывяце,
5) яны мыюць.

**В2. Знайдзіце неўласцівую для беларускай мовы форму дзеепрыметніка. Запішыце яго нарматыўную форму.**

1) зачыненыя дзверы, 2) зжатае поле,
3) пашыты кажух, 4) напісанае сачыненне,
5) створатыя атрады.

**В3. Знайдзіце памылку ў напісанні дзеепрыслоўя. Напішыце слова (словы) правільна.**

1) Кудлатыя нізкія хмары бясконцаю кудзеляю рассцілаліся па небе, сеючы халодным дажджом і дробным градам.
2) Разгрузіўшы воз і паставіўшы, каня ён увайшоў у хату.
3) Бушмар правёў рукой па твары, як бы знімаючы з яго штосьці непрыемнае.
4) Ішлі мы не спяшаючыся, выбіраючы сцежкі і абыходзячы небяспечныя мясціны.
5) Ледзь варушыцца лісце, спачывая ад дзённай спёкі.

## Трэніровачны тэст № 9

**А1. Адзначце словы, якія пішуцца разам:**

1) зрабіць (на)адварот, 2) (на)канец месяца,
3) стаяць (з)боку, 4) падрыхтавацца (як)след,
5) наесціся (ў)волю.

**А2. Адзначце словы, якія пішуцца асобна:**

1) паспеем (усё) роўна, 2) засталіся (ў) трох,
3) ведаць (на) памяць, 4) пакласці (на) верх шафы,
5) зрабіць (па) новаму.

**А3. Адзначце спалучэнні слоў, якія пішуцца асобна:**

1) стараўся (з) выпадку свята, 2) падступаць (у) шчыльную,
3) падумаў (у) голас, 4) аднесці (у) глыб двара,
5) (на) пярэдадні свята.

**А4. Адзначце прыслоўі і блізказначныя ім словы, якія пішуцца разам:**

1) (між) волі спалохаўся, 2) адказаў (на) хаду,
3) бегчы (без) аглядкі, 4) быць (на) відавоку,
5) (як) раз насупраць.

**А5. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:**

1) (даўным) даўно, 2) дзе (небудзь),
3) куды (сьці), 4) (па) просту,
5) (па) чалавечы.

**А6. Адзначце спалучэнні, якія пішуцца ў тры словы:**

1) дзе (ні) дзе, 2) раз (по) раз,
3) дзень (у) дзень, 4) у (рэшце) рэшт,
5) не (на) жарт.

## Трэніровачны тэст № 10

**А1. Адзначце сказы, у якіх *не* пішацца асобна:**

1) Калі кахаць — (***не***) напалову.
2) Ты душны, свет, і сто разоў дзівосны. І (***не***) спазнаны — тысячу разоў!
3) Ці ж да песень (***не***) здольны мой кут?
4) Няма каму пажаліцца на бессань, на (***не***) пагоду ў свеце і душы.
5) Дубы і сосны, (***не***) умеючы клясціся, заўсёды маўкліва прымалі бой.

**А2. Адзначце пропускі, дзе пішацца *не (ня)*:**

Калі б і ў якім настроі н$^{1}$.. ішоў, залюбуешся, н$^{2}$.. можаш, каб н$^{3}$.. залюбавацца, спынішся, н$^{4}$.. ў сілах адвесці вачэй, зачараваны н$^{5}$бывалай прыгажосцю.

**А3. Адзначце пропускі, дзе пішацца *ні*:**

Булён быў н$^{1}$.. смачны, бо ў мяне н$^{2}$.. было н$^{3}$.. солі, н$^{4}$.. мяса, н$^{5}$.. круп.

**А4. Адзначце словазлучэнні са словамі, якія з *не* пішуцца разам:**

1) даўно (не) падмецены двор,
2) да школы (не) далёка,
3) вялікі (не) дахоп,
4) (не) такі смелы,
5) (не) абдымны прастор.

**А5. Адзначце словазлучэнні са словамі, якія з *не* пішуцца асобна:**

1) (не) распрацаваны план,
2) вялікі (не) дарод,
3) крочылі (не) спяшаючыся,
4) далёка (не) горшы вучань,
5) (не) вялікія турботы.

**А6. Адзначце словазлучэнні, дзе ёсць словы, якія без прыстаўкі *не- (ня-)* не ўжываюцца:**

1) неабмежаваная ўлада,
2) неадкладныя справы,
3) неабудны сон,
4) нябеленыя сцены,
5) нехаця адказаць.

**А7. Адзначце словы, якія ніколі не могуць пісацца з *не* разам:**

1) (не) далёка,
2) (не) праўда,
3) (не) шкада,
4) (не) варты,
5) (не) супраць.

**А8. Адзначце сказы, у якіх ужываецца *ні*:**

1) Людзі кажуць: дарагі ... абед, а прывет.

2) Як мой кут маленства ... выползваюць, адрастаюць памяць і любоў.
3) Што б .. рабілася ў сям'і, бабуля не траціла развагі.
4) Было ціха, і лісце на дрэвах зусім ... шумела.
5) Як .. ганарыцца бацькам такім знакамітым сынам!

## Трэніровачны тэст № 11
# СІНТАКСІС І ПУНКІУАЦЫЯ

**А1. Адзначце словазлучэнні з памылкай у дапасаванні:**

1) тры разгалістыя ліпы, 2) цэлых чатыры дні, 3) два апошніх месяцы, 4) чатыры высокія дрэвы, 5) у тры з паловай раза меншы.

**А2. Адзначце словазлучэнні, у якіх няма памылак у кіраванні:**

1) тры разы на тыдзень, 2) марыць аб шчасці, 3) загадчык магазінам, 4) сумаваць па родных, 5) за шэсцьдзесят кіламетраў ад возера.

**А3. Адзначце сказы, у якіх парушаны сінтаксічныя нормы беларускай мовы::**

1) Над кім смяялася, таму і дасталася.
2) Пасля полудня дзед пайшоў у лес па дровы.
3) Спектакль "Паўлінка" даўно стала візітнай карткай Купалаўскага тэатра.
4) Мне з раніцы баліць галава.
5) Архітэктар Свірыдава прапанавала свой праект рэканструкцыі плошчы.

**А4. Адзначце пэўна-асабовыя сказы:**

1) У Аляксея радасна было на душы.
2) Гляджу ў будучыню з надзеяй.
3) Зробім перапынак на паўгадзіны.
4) Спі, мой маленькі сыночак.
5) За грошы розуму не купіш.

**А5. Адзначце няпэўна-асабовыя сказы:**

1) Па радыё перадавалі прагноз надвор'я на заўтра.
2) Жытні колас і васілёк на кашулі бацькавай помню.
3) Над лесам пачынала днець.
4) Тут гасцей прымаць умеюць.
5) Дзяўчыну тую звалі Насця.

**А6. Адзначце безасабовыя сказы:**

1) Гушчар лесу пахне чаборам ім мёдам, жывіцы смалістым настоем.
2) Ні на што не хапала часу.
3) Спыняемся і выходзім з машыны.
4) Хочацца, як у дзяцінстве, пабегчы на перагонкі з хлапчукамі і бухнуцца ў азярыну, доўга малаціць нагамі па вадзе, даваць і даваць нырца.
5) У гэтым месцы пераправы ніколі не было.

**А7. Адзначце радкі, дзе ёсць назыўныя сказы:**

1) Раніца яркая, ціхая. Неба чыстае, васільковае.
2) Залатая асенняя раніца! Хараством ты на свеце адна.
3) Ноч. Цішыня. Аніводнага гуку.
4) Цёмная, маўклівая ноч.
5) Пачатак лістапада. Вечар.

**В1. Знайдзіце словазлучэнне з памылкай у дапасаванні або кіраванні. Запішыце правільны варыянт ужывання слова.**

1) Мікола ўчора зусім недарэчна пачаў жартаваць са свайго сябра.
2) Рамонкавым пылам і пахамі жыта авеялі горад начныя вятры.
3) Журавіны агнём барвовым сярод лясных праталін палымнеюць.
4) Выбачайце нас, калі ласка, за такое нечаканае і вялікае спазненне.
5) Ноччу Ніначка захварэла, і давялося паслаць па доктара.

**В2. Знайдзіце сказ, у якім дапушчана памылка ў каардынацыі дзейніка і выказніка. Запішыце правільную форму ўжывання выказніка.**

1) Шмат дарожак і сцяжынак ляжыць ля нашых хат.
2) Пяць братоў у адну ноч нарадзілася, і ўсе з адным імем.
3) Восем шклозаводаў працуе на Беларусі.
4) Я і мае сябры вельмі хацелі ўбачыць зубра.
5) Абодва пасажыры некаторы час сядзела моўчкі.

**В3. Выпішыце граматычную аснову няпэўна-асабовага сказа.**

1) Калі робіць у ку́пе, не баліць у пу́пе.
2) Васіля, напэўна, бачылі з леснічоўкі.
3) Нехта панура маўчыць, а нехта зусім спіць.

4) Душы свае лечым ад мноства бядот і згрызот самым простым і самым вечным.
5) Дыхнула вільгаццю і пахам сапрэлага лісця.

**В4. Выпішыце граматычную аснову абагульнена-асабовага сказа.**

1) Дзякую вам за добрыя словы!
2) На гонары далёка не паедзеш.
3) У гэтым годзе збяром багаты ўраджай.
4) З узгорка да вярбы пратаптaлі крынічку.
5) Соладка ўлетку ў зелені, у кветках купацца, з ветрам гуляць неспакойным.

**В5. Выпішыце граматычную аснову пэўна-асабовага сказа.**

1) Столькі зроблена карысных спраў.
2) Над сялом і за сялом пахне бэзам і язмінам.
3) Эх, многа дум перадумана ў дарозе адзінокімі галовамі.
4) Занясу суседзям кошык сваіх яблыкаў.
5) Сябрамі не кідаюцца.

**В6. Выпішыце граматычную аснову безасабовага сказа.**

1) Нехта зацягвае песню пад усхліпы гармоніка.
2) Табе складаю свой санет, прапрадзедаў жывая мова!..
3) Рачной мятай, мядовым водарам мурагоў настоена паветра.
4) Хоць бяры ды заварвай чай з гэтага густога пахучага настою.
5) Зноў хочацца зірнуць на тую крынічку.

**В7. Знайдзіце словазлучэнне з памылкай у дапасаванні. Запішыце яго правільна.**

1) тры панельныя дамы,
2) цэлых пяцера сутак,
3) за якія пяць хвілін,
4) вядомы кардыёлаг Падліпская,
5) два з паловай дзесяцігоддзі.

**В8. Знайдзіце сказ з памылкай у дзеяслоўным кіраванні. Запішыце правільна залежнае слова.**

1) Меншы сын вельмі падобны да бацькі.
2) Цяпер, калі не асцерагацца, можна захварэць на грып.
3) Гады зрабілі сваю справу: яна даўно даравала сястру.
4) Я часта хадзіў з бацькам ў лес па дровы.
5) Летам мы бегалі з хлопцамі ў грыбы і ягады.

## Трэніровачны тэст № 12

**А1. Адзначце сказы, у якіх паміж дзейнікам і выказнікам *неабходна* паставіць працяжнік:**

1) Плошча пакоя __ васемнаццаць квадратных метраў.
2) Лес _ пануры і непрытульны.
3) Паляванне __ ёсць паляванне, тут свае законы.
4) Цвіценне падбелу __ адна з прыкмет наступлення вясны.
5) Умець __ за плячыма не насіць.

**А2. Адзначце сказы з некалькімі радамі аднародных членаў:**

1) Не было ўжо ні руні, ні жаўранкаў над ёю, ні сонца.
2) Вечарам на балоце то тут, то там пачалі збірацца купкі — дробныя і большыя, мужчынскія, жаночыя і мяшаныя.
3) На Мядзелі не так прыгожа, як на Нарачы, затое чаек тут больш.
4) Неспакойна шуміць вецер над лесам, і надрыўна галосіць на апусцелым полі, і гудзе-ве ў голым веццi рабін параскіданых сям-там на пажаўцелых узмежках.
5) Ліпа соладка пахла, звонка гудзела ад халадочку зямлі ды бясхмарнага неба, уся аж варушылася ад пчол.

**А3. Адзначце сказы, у якіх прапушчана коска (коскі):**

1) Новы з чырвонай цэглы, па-мастацку зложаны быдунак цешыў вока сваім выглядам.
2) Надзвычай роўныя і высокія сосны гайдаліся ад ветру, рыпелі і аднастайна і ласкава шумелі сваімі верхавінамі.
3) Белай коўдрай улёгся снег на палеткі і лугі, і рэкі, і азёры.
4) Калючы, парывісты вецер то крыху супакойваўся, то паліваў шквалістым густым дажджом.
5) Дождж хоць быў рэдкі і дробны, аднак нашкодзіў нямала.

**А4. Адзначце сказы, у якіх дапушчаны пунктуацыйныя памылкі:**

1) За ўсё: за спагаду, за сапраўдную людскасць і сардэчнасць я дзякую вам.
2) Вакол валяліся: пярыны, падушкі, самакаты, посуд.
3) аднекуль з лесу ці з саду на ржышча пад свежы сноп зляцеў жоўты лісток.
4) Пад дрэвамі ў траве стаяць прыгожыя чырвонагаловыя мухаморы.
5) Дажджы, як пачаліся, так і цягнуліся да самых прымаразкаў.

**А5. Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам словы трэба выдзеліць коскамі:**

1) Палавіну дарогі *а гэта будзе вёрст пяць* Пятрусь быў сярдзіты.
2) Дай мне *ранак* свае песні, перазвоны жаўруковы, калі я іду дарогай праз палі, лугі, дубровы.
3) Па́дуя *як адзначаюць даследчыкі* знаходзілася на скрыжаванні вялікіх міжнародных шляхоў.
4) Месяц *здавалася* здзіўлена спыніўся і спакойна глядзеў з цёмна-сіняга неба.
5) У канцы жніўня вока журботна заўважае апусцелыя палі, пацукравелыя яблыкі ў садах і самотную пажаўцеласць на дварэ, якая надта *відаць* і наганяе незразумелы сум.

Як відаць з падабраных прыкладаў, у такога тыпу заданнях не абавязкова падаюцца аднатыпныя сінтаксічныя канструкцыі. Так, заданне **А5** мае на мэце праверку засваення вучнямі наступных тэм: зваротак, пабочныя словы і сказы, устаўныя канструкцыі.

**А6. Адзначце сказы, у якіх прыдаткі павінны адасабляцца:**

1) Месяц ужо нізкі і барвовы хіліўся да самага захаду.
2) Замошша невялікая вёска нейкім цудам уцалела ў вайну.
3) Павага беларусаў да хлеба як да святыні — агульнае сярод беларусаў пачуццё і звычай вялікай выхаваўчай сілы.
4) Так паказвае свае штукарствы балотная чарацянка дзівосная спявачка нашых лугоў.
5) Неба было нізкае, па-асенняму халоднае і нічога акрамя дажджу не абяцала.

Складанасць гэтага задання ў тым, што не ва ўсіх сказах ёсць прыдаткі. Таму найперш трэба знайсці сказы з прыдаткамі, а толькі пасля гэтага высвятляць, ці адасабляюцца яны.

**А7. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ставяцца коскі:**

1) Нідзе так звонка не чуваць спеў жаваранка_ як у чыстым полі.
2) А што было рабіць, калі ўсе маўчалі_ як вады ў рот набраўшы?
3) Хлопцы сустрэліся_ як даўнія знаёмыя.
4) Асыпаючы карычневыя_ нібы падпаленыя_ пялёсткі, дацвітала груша-дзічка.
5) Рака_ нібы задумалася, прыпыніла свой бег.

**А8. Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам члены сказа адасабляюцца:**

1) *Абсаджаная высокімі ліпамі* алея вяла да самай брамы.
2) Усю ноч дзьмуў вецер *сухі, марозлівы.*
3) Вечар быў *цёплы і ціхі.*
4) *Не варушачыся* дрэмлюць маладзенькія ялінкі.
5) Каб не жаданне злавіць шчупака, я і не падумаў бы *на ноч гледзячы* выбірацца з хаты.

**А9. Адзначце сказы, у якіх дапушчаны пунктуацыйныя памылкі:**

1) Тут жылі, здабываючы хлеб надзённы, яе дзяды і бацька.
2) Зімою, асабліва ў канцы студзеня воўк у нашых мясцінах вельмі небяспечны.
3) А назаўтра ў суботу выпаў першы снег.
4) Дзьмуў лёгкі ветрык, ласкаючы твар і зганяючы спякоту.
5) І завіляла дарога то спадаючы ў хмызовыя лазнякі, то ўзлазячы на верасовыя палянкі.

**А10. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставяцца коскі:**

1) Шумяць і гамоняць несупынныя хвалі жыцця_ і ўсё такія ж шырокія, яшчэ болей прывабныя далечы разгортваюцца перад вачамі.
2) Ноч плыве па адхонах паветраных хваль_ ды трапечуць уверсе далёкія зоры.
3) Справа ад мяне спяваў паляўнічы рог_ і чуваць быў сабачы віскат.
4) Я шчаслівы. Усю вайну ў пехоце_ і ніводнай драпіны.
5) Дзесьці залівалася жаўна_ ды ў вербалозах цяжка стагнаў турок.

**А11. Адзначце сказы з пунктуацыйнымі памылкамі:**

1) Прыказкі заўсёды маюць павучальны сэнс паколькі ў іх — народная мудрасць.
2) “Жыціе” паведамляе, што, калі князёўне споўнілася дванаццаць гадоў, бацькі вырашылі аддаць яе замуж.
3) Толькі ў засені сцен, што высіліся абапал завулачка стаяў чорны цень.
4) Пра што думаў бацька так доўга, мы не ведалі.
5) Чуваць было, як б’е прыбой, і рвуцца хвалі на прычал.

**А12. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку расстаўлены правільна: :**

1) Дзеці бегалі басанож па вадзе, пакуль новы паток ліўня не разагнаў іх па хатах.

2) А дзе промні сонца пранікаюць да самага долу чырванее сунічка.
3) Я ведаў, што як толькі мы прыйдзем набяжыць поўная хата людзей.
4) Чулася толькі, як бразгала маці посудам ды мурлыкаў на печы кот.
5) А касцёл такі, што калі захочаш зірнуцт на яго макаўку, то шапка падае з галавы.

**А13. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх даданая частка звязана галоўнай пры дапамозе злучальнага слова:**

1) Калі сонца паднялося вышэй, на зямлю зноў сышла гарачыня.
2) Горы, на вяршынях якіх бялеў снег, былі строгія і непрыступныя.
3) Хто не заслужыў, таго не ўзнагародзяць.
4) Па сцежцы, што вяла да возера, ішлі касцы.
5) Побач чыгункі, дзе так прыемна купаліся залатыя косы сонейка, цягнулася жоўтая паласа адталай зямлі.

**А14. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх даданая частка звязана галоўнай пры дапамозе падпарадкавальнага злучніка:**

1) Каб дабрацца да таго месца, трэба ісці праз балота.
2) Хлопец толькі цяпер заўважыў, як ён прырос да гэтай слаўнай лясной старонкі.
3) Воін расказаў, як загінуў князь Юрый і яго дружына.
4) Вада Нарачы такая чыстая, што відаць прыдонныя каменьчыкі.
5) Максім прыгледзеўся і ўбачыў, што ляжала на дне рова.

**А15. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца двукроп’е:**

1) Грыбы лепш за ўсё збіраць зранку__ вільготная шапачка зіхаціць на сонцы і добра відаць нават здалёк.
2) Пасыпаў дробненькі сняжок__ узняўся вецер.
3) Я ўстаў, падышоў да калодзежа і ўбачыў__ на вільготным пяску віднелася мноства слядоў.
4) Надвор’е кепскае__ туманна, хмарна.
5) Дождж абмые выгарышча__ трава пойдзе ў рост.

**А16. Адзначце сказы, з пунктуацыйнымі памылкамі :**

1) У лазняку свістаў вецер і недзе задуменна плёскалі ў бераг маркотныя хмары.

2) І так ярка ўспомнілася Міхалку родная вёска, што, каб меў крыла, узняўся і паляцеў бы.
3) Сярод магутных дубоў, што стаялі па пояс у вадзе прыткнуліся адзін да аднаго некалькі чаўноў.
4) Калі ідзеш па сцежцы, пад нагамі шабуршыць мінулагодняе лісце, па яікм гуляюць залацістыя бліскаўкі-зайчыкі.
5) У цішыні было добра чуваць, як між рыпу ўключын звонка сцякаюць цуркі з вёслаў на ўздыме, і плюскоча вада за кармой.

**А17. Адзначце сказы з рознымі відамі сувязі:**

1) Не мы стварылі нашу мову, і нам трэба вельмі асцярожна абыходзіцца з ёю, каб не абразіць волю і вопыт тых беларусаў, што адышлі ў гісторыю чалавецтва.
2) Сонца смаліць ад самага ранку, паветра нагрэлася да таго, што і дыхнуць, здаецца, цяжка.
3) Гаспадар — гэта чалавек, які мае сваю гаспадарку (зямлю, хату, жывёлу) і ўмее карыстацца тым, што набывае ўласнай працай.
4) Ачысцілася ад снегу зямля, прашумелі ручаі і рэкі ды зноў увайшлі ў свае берагі.
5) У канцы сакавіка, калі сонца пачало прыграваць і снег паступова сышоў, мядзведзіца пакінула бярлогу.

**А18. Адзначце сказы, у якіх чужая мова аформлена правільна:**

1) Маці незадаволена паглядзела на дзяўчыну і ледзь прыкметна прыжмурыла вока. "Сціхні, — гаварыў гэты яе знак: — Пераступі старому".
2) "Пачакайце. Вось уселімся ў новую хату, — усміхнуўшыся, адказала Ганна Мікалаеўна, — першым госцем будзеце".
3) "Як гэта лётчыкі бачаць у цемнаце? — дзівіўся Мікола, — і прылятаюць дакладна туды, куды трэба".
4) "Я — дваццаць трэці!"— закрычаў пілот у эфір. — "Іду на пасадку".
5) ""Мяркуйце аб чалавеку па яго справах, а не па яго словах",— адказаў дзядзька.

**А19. Адзначце сказы, якія трэба аформіць, як паказана на схеме "П,– а. – П":**

**А20. Адзначце сказы, якія трэба аформіць, як паказана на схеме "П,– а, – п":**

# ЛЕКСІКА. ФРАЗЕАЛОГІЯ

## Трэніровачны тэст № 13

**А1. Адзначце словы, лексічнае значэнне якіх указана правільна.**

1) бянтэжыцца — хваляваацца, непакоіцца, губляцца,
2) вага́цца — вызначаць сваю вагу шляхам узважвання,
3) ве́тах — месяц у апошняй ква́дры,
4) гале́ча — прылада для галення (брыцця),
5) завіха́цца — 1) паварочвацца вакол сваёй восі, рухацца па кругу; 2) лятаючы, рабіць, апісваць кругі.

**А2. Адзначце словазлучэнні, у якіх парушана лексічная спалучальнасць слоў.**

1) меншы хлопчык; 2) меншая палова;
3) восеньскі пейзаж; 4) восеньскі ландшафт;
5) восеньскі дзень.

**А3. Адзначце пары словазлучэнняў з мнагазначнымі словамі.**

1) жвавая ла́ска — поўны ласкі голас,
2) пайсці па хлеб — зарабляць на хлеб,
3) лад у хаце — зрабіць на свой лад,
4) левая рука — левая фракцыя парламента,
5) паставіць каравул — крычаць “каравул”.

Гэта і наступнае заданне правярае ўменне размяжоўваць амонімы і мнагазначныя словы. Паміж асобнымі значэннямі мнагазначнага слова заўсёды захоўваецца агульная сувязь, якая аб’ядноўвае ўсе значэнні. Так, у значэннях слова *завесці* можна выявіць агульную сэнсавую частку “рухацца, пачаць штосьці”: *завесці дзіця ў садок, завесці гаспадарку, завесці новыя парадкі, завесці гаворку, завесці гадзіннік.* Амонімы — розныя словы, іх значэнні не звязаны паміж сабой, напрыклад: *бярозавы ліст — ліст аб сына, навуковы тэрмін — тэрмін вучобы на курсах, каштаваць пяць тысяч — каштаваць яблык.*

**А4. Адзначце радкі з амонімамі.**

1) заплесці касу — натачыць касу,
2) апавяданні старога падарожніка — прыкласці да раны ліст падарожніка,
3) клетка для тыгра — тканіна ў клетку,
4) крытычны ўзрост — крытычнае становішча,

5) памясціць хворага ў бокс — звймацца боксам.

**А5. Адзначце сказы, у якіх парушана дакладнасць словаўжывання.**

1) Уладкаваўшыся, хлопец зачыніў вочы.
2) Нават нязначны подыхветру разбурае крохкія снегавыя аркі.
3) Палявая дарога ішла праз поле, пасля паварочвала ў лес.
4) Гэта кніга вельмі цікаўная.
5) У твар пругкаю хваляю дыхае вільготна-салодкм паўднёвы вецер.

**А6. Адзначце сказы, у якіх парушаны лексічныя нормы беларускай мовы.**

1) Магутны народны песенны фальклор — крыніца натхнення для любога паэта.
2) Абапал шляху цесна стаялі елкі шумелі, гулі́ ў ветранай высі іх верхавіны.
3) На доўгай, абсаджанай старымі таполямі вуліцы было ціха і бязлюдна.
4) Разам з бацькамі з акупантамі змагалася маладая, амаль юная моладзь.
5) Люблю хадзіць у кніжны магазін. Не помню такога, каб я выйшаў адтуль, нічога не купіўшы.

**А7. Адзначце сказы, дзе ёсць антонімы:**

1) І так згінуў, і так прапаў.
2) Калі б маладосць ведала, а старасць магла.
3) Катку жарты — мышцы смерць.
4) Лепш позна, чым ніколі.
5) Лепш з разумным згубіць, чым з дурнем знайсці.

**А8. Адзначце рады з антонімамі:**

1) рэзкі рух – плаўны рух,
2) рэзкае святло – мяккае святло,
3) рэзкае павышэнне тэмпературы – паступовае павышэнне тэмпературы,
4) рэзкі голас – мілагучны голас,
5) рэзкі чалавек – вясёлы чалавек.

**А9. Адзначце сказы з сінонімамі:**

1) Гарачыня не спадала і пад вечар, стаяла спякота, якой дагэтуль не бачылі.
2) Паўзе па дубчыках гарох, чапляецца вусамі.
3) Пагаслі вясёлыя іскрынкі ў вачах, спахмурнеў, зажурбоціўся дзядзька.
4) Люблю вясну, што ў кветкі, зелень аздобіць радасна зямлю.
5) Я жыў сярод добрых, душэўных і сардэчных людзей.+

**А10. Адзначце сінонімы да слова *актуальны:***

1) глабальны, 2) важны,
3) наспе́лы, 4) надзённы,
5) істотны.

**А11. Адзначце рады, дзе запісаны сінонімы:**

1) абавязкова, безумоўна, неміну́ча,
2) сугучнасць, гармонія, гуманнасць,
3) адуванчык, дзьмухавец, вятра́к,
4) беднасць, гале́ча, нястача;
5) выгляд, знешнасць, аблічча.

**А12. Адзначце сказы са стылістычнымі памылкамі.**

1) Па шматлікіх галінках, па цёмнай ад вільгаці кары дуба сплываюць струмені дажджу.
2) Творчасць М.Багдановіча адыграла вялікае значэнне ў развіцці беларускай паэзіі.
3) За якія пяць хвілін рэдкі дождж змяніўся праліўным ліўнем.
4) Ад паху кветак круціцца галава.
5) Між тым насоўвалася радасная падзея.

**В1. Пазнайце слова па лексічным значэнні:**

*1) бацькаў або матчын брат; цётчын муж; 2) дарослы мужчына наогул.*

**В2. Запішыце прыметнік, які мае лексічнае значэнне:**

*складае кантраст, зусім процілеглы.*

**В3. Выпішыце слова, якое ў прыведзеным радзе з'яўляецца лішнім:**

*марфема, сінтаксіс, нарыс, лексіка, арфаграма.*

**В4. Запішыце слова, якое мае значэнне** *"дата, дзень, у які спаўняецца яшчэ адзін год з часу якой-небудзь падзеі"* **, у той форме, у якой яно ўжываецца ў сказе.**

Беларусь рыхтуецца да святкавання 60-й ________ Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

# Трэніровачны тэст № 14

**А1. Адзначце фразеалагізмы, значэнне якіх растлумачана правільна:**

1) Апусціць рукі — страціць здольнасць або жаданне займацца чым-небудзь.+
2) За дрэвамі не бачыць лесу — за чым-небудзь дробным не заўважаць значнага, вялікага.+
3) Ні брат ні сват — пра таго, хто ні ад каго не залежыць, каму ўсё лёгка даецца.
4) Даць галаву на адрэз (на адсячэнне) — рызыкаваць жыццём.
5) Глытаць словы — маўчаць, нічога не гаварыць.

**А2. Адзначце сінонімы да фразеалагізма *без дай прычыны:***

1) бессэнсоўна,
2) бязмэтна,
3) беспадстаўна,+
4) немэтазгодна,
5) нізавошта.+

**А3. Адзначце антонімы да фразеалагізма *з вузел ростам:***

1) маленькі,+
2) нікчэмны,
3) мізэрны,+
4) малы,+
5) .

**А4. Адзначце сказ (сказы), у якім няправільна ўжыты ўстойлівы выраз:**

1) Яўхім хадзіў як сам не свой па вёсцы. Работа, за якую б ён ні браўся, валілася ў яго з рук.
2) Да вёскі было рукою падаць.
3) Ноч светлая хоць вока выкалі.+
4) Гэтую пушчу лось ведаў як свае пяць пальцаў.+
5) Стафанковіч сціх як мыла з’еўшы.

**В1. Знайдзіце фразеалагізм, які ўжыты з памылкай. Запішыце ўстойлівы выраз правільна (у той форме, у якой ён ужываецца ў сказе).**

1) Чаго ты сюды забраўся? Я ўжо ногі адбіў, цябе шукаючы.
2) Пагаварыў, адвёў душу, і стала неяк лёгка-лёгка.
3) Былі ў дуброве мясціны, у ельніку, дзе адзін пры адным сядзелі рудагаловыя белагаловікі.

4) Будзі Грышку на золку. Хай не адлежвае бакі, а наладзіць касу́ ды з расой укосіць трохі.
5) Я цябе ніхто і не пытаецца! Гэта ж трэба, ***кату па калена***, а ўжо парады мне дае!

**В2. Знайдзіце фразеалагізм, у якім адно слова заменена. Запішыце патрэбнае слова (разам з прыназоўнікам, у той форме, у якой ён ужываецца ў сказе).**

1) Разам, плячо ў пляча, прайшлі мы праз страшныя выпрабаванні.
2) Усім было зразумела, у чый агарод кідаюць каменьчыкі.
3) Я чалавек адказны і слоў на ***паветра*** не кідаю.
4) Гарлахвацкі мог любога ў барані рог скруціць.
5) Ён добра разумеў, што трэба жыць сваім розумам.

# ТЭКСТ. ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫЯ СТЫЛІ МАЎЛЕННЯ

## Трэніровачны тэст № 15

**А1. Вызначце від і сродкі сувязі сказаў у тэксце.**

За вёскай, нас старой бярозе, здаўна вяліся буслы. З выраю яны прылятталі звычана ў красавіку. Птушкі рабілі некалькі кругоў над вёскай, садзіліся на бярозу, рамантавалі гняздо. У гэтым гняздзе яны пазней выводзілі і гадавалі буслянят.

1) паралельная сувязь,
2) паслядоўная сувязь,
3) сінанімічныя замены,;
4) займеннікі,
5) лексічныя паўторы.

У сказах з *паслядоўнай сувяззю* думка паслядоўна перадаецца ад аднаго сказа да другога, сувязь ажыццяўляецца праз новае: у кожным наступным сказе вядомым становіцца тое, што было новым у папярэднім. Кожны новы сказ дадае новыя звесткі, якія дапаўняюць папярэдні сказ. Пры паслядоўнай сувязі сказы нельга памяняць месцамі. Для гэтага віду сувязі характэрныя такія сродкі сувязі сказаў, як: лексічныя паўторы, сінанімічныя замены (у тым ліку і кантэкстуальныя сінонімы, апісальныя выразы — перыфразы), займеннікі, злучнікі.

Пры *паралельнай сувязі* сказы аб'яднаны тэматычна з самым першым сказам, раскрываюць яго сэнс і звязаны з ім граматычна. Сэнсавая сувязь ажыццяўляецца праз вядомае (*малюнак 3а і 3б*) або праз вядомае ў першым сказе (*малюнак 4*), гэта значыць, што пра адно і тое ж вядомае ў кожным новым сказе дадаецца новая інфармацыя. Таму ўсе сказы, пачынаючы з другога, можна пераставіць месцамі. Для паралельнай сувязі характэрны наступныя сродкі сувязі сказаў: сінтаксічны паралелізм (аднолькавы парадак слоў); аднатыпныя граматычныя формы (трывальна-часавыя формы дзеясловаў); займеннікі; злучнікі; часціцы.

**А2. У якой паслядоўнасці трэба размясціць сказы, каб атрымаўся тэкст? Адзначце правільны адказ.**

1. Пазней заплакалі перад Купаллем травы: меліся назаўтра загінуць. 2. Пасля пупышкі сталі зялёныя, а лясы — цёмныя. 3. Потым, перад Вялікаднем, пачалі сачыцца празрыстым сокам пні ссечаных бяроз. 4. А затым прыйшла чарга палегчы каласам. 5. Спачатку выпусцілі свае коцікі вербы.

1) 1, 3, 4, 2, 5, 2) 4, 3, 5, 2, 1,
3) 3, 1, 5, 4, 2, 4) 5, 3, 2, 1, 4,+
5) 5, 4, 3, 1 , 2.

**А3. Вызначце тып маўлення фрагмента тэксту.**

Некаторыя даследчыкі выказвалі думку, быццам назва горада паходзіць ад назвы дзікага першабытнага быка тура, які існаваў у часы Кіеўскай Русі, а потым вымер. Здаецца, няма падстаў прымаць такое меркаванне як адзіна верагоднае. Па-першае, мы маем выразнае сведчанне летапісца: у горадзе кнбяжыў Тур, ад якога мясцовыя жыхары пачалі называцца тураўцамі. Па-другое назвы старадаўніх гарадоў вельмі часта паходзяць ад імені заснавальніка ці ад назвы ракі, на беразе якой паселішча знаходзіцца. *(Паводле В.Вольскага)*

1) апісанне;
2) разважанне з элементамі апісання;
3) апавяданне;
4) апавяданне з элементамі разважання;
5) разважанне.

**А4. Адзначце, як можна закончыць выказванне.**

*Мастацкі стыль абслугоўвае духоўную сферу жыцця грамадства. Гэта стыль мастацкіх тэкстаў розных жанраў:*

1) апавяданне, 2) апісанне,
3) рэпартаж, 4) паэма,
5) эсэ.

**А5. Адзначце назвы жанраў публіцыстычнага стылю.**

1) артыкул у газеце; 2) нататка;
3) артыкул у слоўніку; 4) фельетон;
5) справаздача.

**А6. Адзначце жанры, якія не ўласцівы публіцыстычнаму стылю.**

1) інтэрв'ю; 2) палітычны памфлет;
3) навела; 4) аратарскае выступленне;
5) анатацыя.

**А7. Вызначце стыль і жанр фрагмента тэксту.**

Рэльеф Беларусі раўнінны, у ім спалучаюцца плоскія, хвалістыя, узгорыстыя ўчасткі. Тэрыторыя Беларусі знаходзіцца ў басейнах Чорнага і Балтыйскага мораў. У Беларусі больш за 10 тысяч азёраў. У асобных раёнах яны злучаны невялікімі пратокамі, рэчкамі і ўтвараюць цэлыя групы. Прыроднае расліннае покрыва займае каля 67 % тэрыторыі Беларусі. Адносіцца да 2 геабатанічных абласцей: таежнай хвойна-лясной і Еўрапейскай шыракаліста-лясной. З поўначы на поўдзень цёмнахвойныя яловыя лясы зменьваюцца шыракалістымі.

1) мастацкі стыль, апавяданне;
2) публіцыстычны стыль, нататка;
3) навуковы стыль, рэцэнзія;
4) публіцыстычны стыль, артыкул;
5) навуковы стыль, артыкул.

**А8. Вызначце стыль і тып фрагмента тэксту.**

Вёска размясцілася на стромкім беразе, хаты ляпіліся на самым яго грэбні. Калі глядзець на вёску з ракі, то побач з абрысамі дрэў выразна вымалёўваюцца стрэхі з комінамі. Стрэхі ішлі роўненька, былі яны высокія і ў асноўным шыферныя. А вось коміны на кожнай тырчэлі розныя. Адзін комін, шырокі і прысадзісты, вылазіў на страху. Ён быў важны, як і яго гаспадар. Другі вытыркаўся доўгай і тонкай жалезнай трубой. Ён выгляд меў такі, быццам упершыню трапіў на гэты свет і застыў у нямым здзіўленні. У трэцяга над трубой быў прышлёпнуты шырокі брыль. Усе коміны ганарыста красаваліся над берагавым грэбнем. *(Паводле А.Кажадуба)*

1) гутарковы, апавяданне;
2) мастацкі, апавяданне;
3) гутарковы, апісанне;
4) мастацкі, апісанне;
5) публіцыстычны, развažанне.

**А9. Вызначце стыль і жанр фрагмента тэксту.**

Абітурыенты, залічаныя на 1-ы курс гістарычнага факультэта, павінны да 3 верасня з'явіцца ў кабінет сакратара для атрымання неабходнай дакументацыі. Асобы, якія маюць патрэбу ў атрыманні месца ў інтэрнаце, могуць напісаць на імя дэкана заяву, якая будзе

разглядацца на сумесным пасяджэнні дэканата і студэнцкага савета.

1) навуковы, анатацыя,
2) публіцыстычны, рэпартаж,
3) афіцыйна-дзелавы, аб'ява,
4) афіцыйна-дзелавы, інструкцыя,
5) навуковы, даведка.

**В1. Вызначце стыль фрагмента тэксту.**

Сэнсавымі тыпамі мовы з'яўляюцца апавяданне, апісанне, разважанне. Тып мовы залежыць ад зместу (тэмы) выказвання, а значыць і задачы, якую ставіць перад сабой аўтар выказвання (асноўнай думкі). У апавяданні паведамляецца пра якое-небудзь здарэнне, выпадак, якую-небудзь з'яву, факт; дзеянні, падзеі адбываюцца адна за другой, у пэўнай паслядоўнасці. У апісанні абмалёўваюцца адначасова асобы, прадметы, прыметы, дзеянні, падзеі. У разважанні выяўляюцца розныя меркаванні, суджэнні, погляды, прычыны і вынікі; для абгрунтавання выказанай думкі прыводзяцца доказы (аргументы) і робяцца вывады. Варта адзначыць, што часцей за ўсё ў тэксце выкарыстоўваюцца элементы розных тыпаў мовы.

**В2. Вызначце тып маўлення фрагмента тэксту.**

Наша мова вечная, бо яна ўся, як наш характар. Часам мяккая, пяшчотная! А часам мужная, поўная сілы і цвёрдасці. «Эль» – як салодкае віно, «дзе» – як шкляной палачкай па крышталю, мяккае [с'] – як соннае ціўканне сінічкі ў гняздзе. І побач [р], як гарошына ў свістку. І доўга адкрыта, пявуча гучаць галосныя. А [г] прыдыхае так ласкава, як маці на лобік дзіцяці, каб перастаў сніць дрэнны сон! Дык што ж лепей за цябе, мова мая, мова наша! За цябе, даўняя, за цябе, вечна жывая, за цябе, неўміручая?! *(Паводле У.Караткевіча)*

**В3. Запішыце слова, якога не хапае ў прыведзенай схеме тыпу маўлення:**

________________ — *доказы — вывад.*

**В4. Запішыце не названы ў прыведзеным радзе стыль маўлення:**

*Публіцыстычны, афіцыйна-дзелавы, гутарковы, навуковы.*

**В5. Запішыце не названы ў прыведзеным радзе тып маўлення:**

*Разважанне, апісанне.*

**В6. Вызначце стыль і жанр фрагмента тэксту.**

Абодва вучыліся ў тэхнікуме ў адным з абласных цэнтраў Беларусі і былі самымі старанны́мі ўдзельнікамі краязнаўчага гуртка. Можа, яны таму так цікавіліся краязнаўствам, што нарадзіліся ў горадзе і ўвесь свой век пражылі ў ім. Прыроду, лес, вёску хлопцы ведалі толькі з тых экскурсій, якія наведвалі, калі вучыліся ў школе. Далей як за дзесяць кіламетраў ад горада ім ніколі не даводзілася быць. Вучыліся абодва добра, чыталі шмат кніжак, асабліва прыгодніцкіх — Жуля Верна, Майна Рыда, Купера і іншых. Цікавілі іх розныя дзікуны, індзейцы, якіх цяпер бадай ужо зусім няма. Захапляліся рознымі прыгодамі з іх жыцця, што адбываліся шмат гадоў таму. Марыл праі пальмы, джунглі, а не бачылі добрай пушчы, якая была непадалёк ад горада. Уяўлялі сабе розныя паляванні на тыграў, сланоў, ільвоў, а вавёркі на волі не бачылі. Марылі пра мора, караблі, а не бачылі вялікага возера за дваццаць кіламетраў ад горада. *(Паводле Янкі Маўра)*

**В7. Выпішыце слова, якой ў прыведзеным радзе абазначае лішні жанр маўлення:**

*даверанасць, нарыс, фельетон, нататка, рэпартаж.*

**В8. Выпішыце жанр навуковага стылю:**

*прамова на мітынгу, пародыя, пратакол, манаграфія, артыкул у газеце.*

**В8. Выпішыце жанр афіцыйна-дзелавога стылю:**

*дысертацыя, казка, распіска, рэпартаж, прадмова.*